***Антонава Н. У.**, дактарант Акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Галяш Г. А.**, настаўнік вышэйшай катэгорыі беларускай мовы і літаратуры ліцэя Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта*

# Беларуская мова. I клас

## (установы адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання)

### *Урокі 6–10*

*Працяг. Пачатак гл. № 6 за 2024 г.*

### Урок 6. Я і мая сям'я. Мае сваякі

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [дж], пазнаёміць з лексікай на тэму «Мае сваякі», пазнаёміць са значэннем выразу «дзіравая памяць»; фарміраваць уменні аўдзіравання (прагназаваць змест тэксту па малюнках, суадносіць пачутае з малюнкавым радам, адказваць на пытанні па змесце твора, вызначаць у тэксце новыя словы лексічнай тэмы); фарміраваць уменні гаварэння (паўтараць за настаўнікам сказы, арыентуючыся на схемы, выказвацца па малюнках да твора, будаваць маналагічнае выказванне пра сваю сям'ю); развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць; выхоўваць паважлівыя адносіны да сваякоў, да старэйшых.

**Абсталяванне:** малюнкі з дэманстрацыйнага матэрыялу: «Сям'я на дачы», мама з татам, бабуля з дзядулем, чаравікі, прас, шкарпэткі.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

Узнаўленне і замацаванне навыку вымаўлення спалучэння гукаў [шч]. Праца з чыстагаворкай:

Шча-шча-шча — злавілі мы ля... (*шча*),
шчу-шчу-шчу — я яго пачы... (*шчу*).

Настаўнік вымаўляе чыстагаворку па адным радку, вучні паўтараюць і дадаюць патрэбны склад. Кожны радок паўтараецца хорам і індывідуальна. Потым вучні па памяці вымаўляюць усю чыстагаворку. Вучні ацэньваюць правільнасць вымаўлення і тлумачаць адрозненні ў вымаўленні гука [ч] і спалучэння гукаў [шч] у рускай і беларускай мовах.

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыку вымаўлення гука [дж] (заданне 1 вучэбнага дапаможніка).**

Настаўнік запрашае вучняў разгледзець малюнкі і закончыць выказванні ў адпаведнасці з малюнкамі:

Я хаджу з … (*палкамі*).
Я гляджу ў … (*бінокль*).
Я сяджу ў … (*позе йога*).

Настаўнік просіць паўтарыць словы, якімі назвалі дзеянні чалавека. Вызначаецца новы для вучняў гук [дж]. Вымаўленне гука [дж] ізалявана хорам, індывідуальна, па радах.

Далей праводзіцца работа па дарэчным ужыванні слоў з гукам [дж]. Вучням трэба хорам правільна дапоўніць верш, які вымаўляе настаўнік:

У школу кожны дзень... (*хаджу*).
За партай ціха я... (*сяджу*).
На настаўніцу... (*гляджу*).

— Хто мог сказаць гэтыя словы? *(Вучань ці вучаніца.)*

**2. Азнаямленне з лексічнай тэмай «Мае сваякі».**

**2.1. Уступная гутарка.**

— У кожнага чалавека ёсць родныя людзі — сваякі (родственники). Сёння даведаемся, як іх называюць па-беларуску.

— Паслухайце верш. Запомніце словы, якімі называюць сваякоў па-беларуску.

Мы — працоўная сям'я:
дзед, бабуля, тата, мама,
брат з сястрой,
таксама — я.

*В. Лукша* [11]

— Працоўная — значыць «трудовая». Назавіце сваякоў, пра якіх гаворыцца ў вершы. Назавіце членаў вашай сям'і па-беларуску.

Завучванне верша на памяць на слых па адным радку. Паўтарэнне верша вучнямі на памяць па жаданні.

Вызначэнне і паказ персанажаў верша на малюнку задання 2 вучэбнага дапаможніка.

**2.2. Выкананне задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

Разглядванне ілюстрацыі пад кіраўніцтвам настаўніка:

— Разгледзьце малюнак. Знайдзіце і пакажыце дзядулю, бабулю. Вымавіце гэтыя словы хорам. Хто прыехаў да іх у госці? Што робіць хлопчык? Кім ён даводзіцца дзядулю і бабулі? Маме і тату? Што робіць дзяўчынка? Кім яна даводзіцца дзядулю і бабулі? Маме і тату?

Прыдумванне і агучванне рэплік персанажаў, каб яны ўтрымлівалі словы ветлівасці і зварот да іншых членаў сям'і. Напрыклад: *Як даехалі, сынок? Дачушка, давай патрымаю ўнучачку!*

***Хвілінка адкрыццяў.***

Настаўнік паведамляе, што па-беларуску кажуць «мама з тата**м**», «бабуля з дзядуле**м**» (вымаўляе выразна). Настаўнік паказвае малюнкі з дэманстрацыйнага матэрыялу і задае пытанні:

— Хто нас песціць і галубіць?

— Хто нам дорыць падарункі?

— Хто нас любіць сэрцам шчырым?

Адказ павінен адпавядаць малюнку. Настаўнік гаворыць:

— Па-беларуску можна таксама казаць: *маці*, *мамачка, матуля, матулечка, тата*, *татачка, татуля, бацька.* Давайце вымавім гэтыя словы хорам.

Вучні паўтараюць хорам за настаўнікам.

**2.3. Работа з дэманстрацыйным матэрыялам.**

Выкананне заданняў па малюнку «Сям'я на дачы», замацаваным на дошцы.

— Разгледзьце малюнак. На дачы сабраліся сваякі. Назавіце і пакажыце на малюнку, пра каго са сваякоў я гавару:

Гэты член сям'і люляе маленькае дзіця ў калысцы. *(Маці.)*

Гэты член сям'і дорыць кветкі. *(Дзядуля.)*

Гэты член сям'і дапамагае матулі. *(Дачка.)*

Гэты член сям'і вяжа пруткамі на лаўцы. *(Бабуля.)*

Гэты член сям'і рамантуе плот. *(Тата.)*

Гэты член сям'і дапамагае тату. *(Сын.)*

Гэты член сям'і ціхенька спіць у калысцы. *(Сынок ці дачушка, немаўлятка.)*

Адкажыце на пытанні:

— Што робіць маці? Што робіць тата? Хто яму дапамагае? Што прынесла дачка? Дзе сядзіць бабуля? Што ёй прынёс дзядуля? Назавіце сваякоў на малюнку.

**2.4. Выкананне задання 3 вучэбнага дапаможніка.**

Распазнаванне і называнне персанажаў (тата, мама, сын, дачка, бабуля, дзядуля). Падбор абагульняльнага слова (*сям'я*). Складанне выказвання па схеме. Гутарка пра павагу і клопат у сям'і.

**3. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**3.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

Прагнознае «чытанне» малюнкавага рада. Падрыхтоўчая гутарка перад успрыманнем на слых:

— Разгледзьце малюнкі. Каго са сваякоў вы на іх бачыце? Куды збіраўся хлопчык?

Слоўнікавая работа праводзіцца з дапамогай малюнкаў прадметаў:

Чаравікі — [мал. чаравікаў] (вымаўленне слова хорам).

Прас — [мал. праса] («Што значыць адпрасаваць?» Вучні адказваюць па-руску).

Шкарпэткі — [мал. шкарпэтак] (вымаўленне слова хорам).

***Хвілінка адкрыццяў.***

— Як вы разумееце выраз «дзіравая памяць»? Калі і пра каго так гавораць?

Пастаноўка мэтавага пытання: паслухаць апавяданне і сказаць, чаму хлопчык трапіў у такую сітуацыю.

**3.2. Успрыманне твора на слых.**

Слуханне апавядання, суаднясенне зместу з малюнкавым радам. Пры неабходнасці актуалізацыя ў час слухання.

***Дзіравая памяць***

Толькі я сеў піць чай ды есці гарачыя аладкі, як убачыў свае чаравікі. Бабуля зноў іх не пачысціла. І я крыкнуў:

— Бабуля!

— Што здарылася?

— Скажы, што ты сёння забылася зрабіць?

— Падручнікі твае знайшла, сабрала, — пачала пералічваць бабуля.

— Штаны адпрасавала. У партфель тры яблыкі паклала...

— Эх, бабуля! Сам не скажу, дык не ўспомніш. Бачыш, чаравікі не начышчаныя! Як ты магла забыцца?

— Ох, старая, зусім страціла памяць. Пякла аладкі, а пра чаравікі забылася. Зараз, унучак, зараз.

Бабуля зняла з маіх ног чаравікі і пачала іх чысціць.

Я з'еў тры аладкі, дапіў чай. А бабуля ўсё чысціла мае чаравікі. Ну і марудлівая!

— Ой, у школу спазнюся.

Бабуля нешта крыкнула мне ўслед, але я не пачуў за дзвярамі.

Паспеў! Ускочыў у клас, а ўсе ў класе чамусьці смяяцца пачалі. Выцер я пот з твару, зірнуў на ногі і жахнуўся: у адных шкарпэтках прыбег у школу. Ну, бабуля, пачакай. Чаравікі пачысціць пачысціла, а на ногі мне абуць забылася. Вось дзіравая памяць!

*М. Капыловіч* [12]

**3.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

Гутарка па пытаннях:

— Назавіце сваякоў, пра якіх гаворыцца ў творы. Чым быў не задаволены хлопчык? Што зрабіла бабуля, каб сабраць унука ў школу? Што забылася зрабіць?

Праблемнае пытанне па змесце апавядання:

— Як вы думаеце, у каго на самай справе дзіравая памяць: у хлопчыка ці ў бабулі?

— Што трэба было б зрабіць хлопчыку, на вашу думку? Як хлопчык назваў бабулю, калі звяртаўся да яе? Як трэба звяртацца? Хто вас збірае ў школу? Як вы называеце бабулю? Як вы ставіцеся да сваіх бабуль і дзядуль? Як ім дапамагаеце?

**3.4. Выкананне заданняў на падставе праслуханага твора.**

Выказванні вучняў па кожным малюнку да твора. Разгляд схем сказаў. Узнаўленне вучнямі назваў прадметаў на малюнках у схемах сказаў. Складанне сказаў па схемах, «прачытванне» іх:

1. Бабуля забылася наваксаваць чаравікі.
2. Унук папіў чаю, з'еў аладкі.
3. Хлопчык пабег у школу.
4. Унук прыбег у школу ў адных шкарпэтках.

Выкананне маўленчага задання:

— Раскажыце пра сваю сям'ю. Ці ёсць у вас браты, сёстры? Яны старэйшыя ці малодшыя за вас? Як вы клапоціцеся пра бабулю і дзядулю?

**III. Вынік урока.**

— Якое спалучэнне гукаў вучыліся вымаўляць на ўроку? Якія назвы сваякоў вы запомнілі? Як можна выказаць павагу да сваякоў? Як трэба называць маму, тату, бабулю і дзядулю?

## Урок 7. Я і мая сям'я. Мая кватэра

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [р], пазнаёміць з лексікай на тэму «Мая кватэра», словамі, якія аднолькава гучаць у рускай і беларускай мовах, але абазначаюць розныя прадметы (*диван — дыван, пакой — покой, люстра — люстра*); фарміраваць уменні аўдзіравання (суадносіць пачутае з малюнкавым радам, адказваць на пытанні, вызначаць у тэксце новыя словы лексічнай тэмы); фарміраваць уменні гаварэння (правільна называць прадметы, адказваць на пытанні з выкарыстаннем новых слоў, канструяваць сказы па схемах, пераказваць па малюнках з выкарыстаннем слоў тэксту); развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць; выхоўваць ашчадныя адносіны да рэчаў, любоў і павагу да матулі.

**Абсталяванне:** малюнкі з дэманстрацыйнага матэрыялу: дыван, канапа, люстра (для асвятлення), люстра (у якое глядзяцца), «Дзіцячы пакой», «Гасціная»; карткі з літарамі ***Р***, ***Б***; лялька.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

Узнаўленне навыку вымаўлення гука [дж] праводзіцца шляхам успрымання на слых вучнямі слоў (*агароджа, джала, ураджай, саджанец*) і вымаўлення іх некалькімі вучнямі, якія запомнілі ўсе словы адразу. Значэнне кожнага слова тлумачыцца вучнямі і пры неабходнасці настаўнікам. Потым словы вымаўляюцца хорам. Вызначаецца месца гука [дж] у кожным слове. Па заданні настаўніка вучні дапаўняюць выказванні:

Я агароджу (што раблю?) … (*гараджу*).

Пчала джалам (што робіць) … (*джаліць*).

Увосень ураджай (што робяць?) … (*збіраюць*).

У садзе саджанцы (што робяць?) … (*высаджваюць*).

Вучні вымаўляюць словы з гукам [дж].

II. Вывучэнне новай тэмы.

**1. Фарміраванне навыку вымаўлення гука [р]. Выкананне задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

З кожным словам (*якар, арэх, грыб, рабіна, рукзак, буквар*) праводзіцца работа з выкарыстаннем картак з літарамі ***Р***, ***Б*** у наступнай паслядоўнасці:

1) вучні называюць прадмет на малюнку па-руску, настаўнік перакладае слова на беларускую мову;

2) вучні ўслед за настаўнікам выразна вымаўляюць слова і вызначаюць месца гука ў слове з апорай на схему;

3) «чытанне» схемы слова: вымаўленне вучнямі слова па-беларуску з утрыравана цвёрдым гукам [р].

Фармулёўка вываду, што гук [р] у беларускай мове вымаўляецца толькі цвёрда.

**2. Азнаямленне з лексічнай тэмай «Мая кватэра».**

**2.1. Выкананне задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

Словы настаўніка пра наваселле. Суаднясенне вучнямі пачутага з малюнкам.

— Разгледзьце малюнак. Назавіце сваякоў. Скажыце, куды прыехала сям'я. Чаму ўсе такія шчаслівыя? Здагадайцеся пра тэму ўрока. Куды заходзіць сям'я? Вымавім па-беларуску: кватэра, калідор. Назавіце па-руску, на што паказвае зялёная стрэлка. Вымавім па-беларуску: сцяна. Назавіце па-руску, на што паказвае карычневая стрэлка. Вымавім па-беларуску: падлога. Назавіце па-руску, на што паказвае сіняя стрэлка. Вымавім па-беларуску: столь. А цяпер паглядзім, якія вы былі ўважлівыя. (Настаўнік просіць вучняў паказаць у класным памяшканні сцяну, падлогу, столь. Потым, наадварот, просіць вучняў хорам назваць тое, што ён паказвае: столь, падлогу, сцяну. Потым называе колер стрэлкі, а вучні адказваюць, на што яна паказвае.)

**2.2. Работа з дэманстрацыйным матэрыялам.**

Слова настаўніка. Настаўнік распавядае ад імя хлопчыка ці дзяўчынкі. Пажадана выкарыстаць для гэтага ляльку. У працэсе аповеду паказвае прадметы на малюнку. Вучні слухаюць і сочаць па малюнках на дошцы:

— Наша сям'я пераехала ў новую кватэру. У ёй два пакоі. (Настаўнік паказвае два малюнкі і пытаецца: «Што значыць слова *пакой*?»). У мой пакой (паказвае) купілі ложак (паказвае), пісьмовы стол (паказвае), кніжную шафу (паказвае). Ёсць тут і шафа для адзення (паказвае).

Настаўнік перадае лялькy аднаму з вучняў, ён паказвае і гаворыць пра абстаноўку ў пакоі. Вучні ацэньваюць, ці правільна названыя прадметы мэблі.

Потым настаўнік скіроўвае ўвагу вучняў на наступны малюнак дэманстрацыйнага матэрыялу і працягвае расказ ад імя лялькі.

— Вечарам уся наша сям'я збіраецца ў гасцінай (паказвае). На столі вісіць прыгожая люстра (паказвае). На падлозе ляжыць дыван (паказвае). Мы з сястрой (братам) гуляем на дыва́не. На канапе (паказвае) сядзяць мама і тата. Яны глядзяць тэлевізар.

Настаўнік зноў перадае лялькy аднаму з вучняў. Ён паказвае на малюнку і гаворыць пра абстаноўку ў пакоі. Астатнія вучні ацэньваюць правільнасць назваў прадметаў мэблі і членаў сям'і. Настаўнік заахвочвае вучняў, якія імкнуцца называць прадметы па-беларуску.

**2.3. Выкананне задання 3 вучэбнага дапаможніка.**

Паведамленне настаўнікам назваў прадметаў на малюнку. Паўтор і суаднясенне вучнямі назвы прадмета і яго малюнка.

— Пакажыце пісьмовы стол, кніжную шафу, шафу для адзення. Пакажыце ложак. Для чаго ён? Чаму так назвалі па-беларуску?

Замацаванне тэматычнай лексікі праводзіцца праз практыкаванне па размеркаванні прадметаў мэблі, адлюстраванай у заданні 3, па пакоях на малюнку з задання 2. Паказ і называнне пакояў кватэры на малюнку з задання 2.

— Вызначыце па малюнку задання 2, што паставілі ў дзіцячы пакой; у гасціную.

***Хвілінка адкрыццяў.***

Настаўнік цікавіцца, ці заўважылі вучні словы, якія гучаць аднолькава ў рускай і беларускай мовах, а абазначаюць розныя прадметы. Практыкаванне па размежаванні руска-беларускіх міжмоўных амонімаў (*диван — дыван, пакой — покой, люстра — люстра*) праводзіцца па малюнках задання 3 вучэбнага дапаможніка. Вучні выконваюць заданні і адказваюць на пытанні:

— На малюнках у падручніку знайдзіце і пакажыце канапу. Для чаго яна? Пакажыце дыван. Дзе можа ляжаць дыван? Дзе можа вісець дыван? Ці можа дыван стаяць? Пакажыце люстру. Дзе вісіць люстра? Пакажыце люстра. Для чаго яно?

Заданне на дыферэнцыяцыю міжмоўных амонімаў. Настаўнік дэманструе малюнкі дывана, канапы, люстры, люстра і запытваецца:

— Гэта дыван? Гэта люстра?

Вучні адказваюць «так» ці «не».

**3. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**3.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

Тэматыка падрыхтоўчай гутаркі перад успрыманнем на слых — дапамога вучняў членам сям'і, у прыватнасці матулям. Прагназаванне зместу апавядання па малюнкавым радзе.

Слоўнікавая работа:

ануча — тканіна, якой мыюць падлогу (вучні знаходзяць і паказваюць анучу на малюнку ў вучэбным дапаможніку);

вячэра — вячэрні прыём ежы (вучні знаходзяць і паказваюць на малюнку ў вучэбным дапаможніку стол, накрыты для вячэры);

гаспадыня — (рус.) хозяйка.

Пастаноўка праблемнага пытання:

— Паслухайце апавяданне і скажыце, як Настачка выказала любоў і павагу да маці.

**3.2. Успрыманне твора на слых.**

Слуханне апавядання, суаднясенне зместу з малюнкавым радам — паказ адпаведнага малюнка ў працэсе слухання. Пры неабходнасці актуалізацыя ў час слухання.

***Як Настачка маме дапамагала***

Прыйшла мама з працы ды пачала ў кватэры прыбіраць. Прыбірала, прыбірала, села ў крэсла і кажа:

— Нешта галава разбалелася. Адпачну я крыху, дачушка, а пасля падлогу памыю.

Легла яна на ложак і заснула. Паглядзела Настачка, што мама спіць, накрыла яе шарсцяной хусткай, выйшла на пальчыках са спальні і дзверы за сабой прычыніла.

І села ў вялікае крэсла. А ў пакоі непарадак. Каля дзвярэй вядро з вадой стаіць, сярод пакоя крэслы састаўлены. Няўтульна, нават урокі рабіць не хочацца. І пачала Настачка думаць, як маме дапамагчы.

«Вазьму ды сама падлогу памыю, — рашыла яна. — Немаленькая ўжо, у школу хаджу». І ўзялася за работу.

Нялёгка ўпраўляцца з вялікай анучай, калі ў цябе такія маленькія рукі. Памалу справа пайшла на лад. Яна радавалася, што памыла падлогу, маме дапамагла.

— А цяпер збяру вячэру, — сказала сабе Настачка і пачала завіхацца каля стала.

Калі чайнік закіпеў, яна выключыла пліту і пайшла будзіць маму.

— Ой, як доўга я спала! — глянуўшы на гадзіннік, усклікнула мама. — Хутка тата з працы вернецца, а яшчэ падлога не памыта і вячэра не сабрана.

Настачка ўсміхнулася, але нічога не сказала. А мама выйшла са спальні і вачам не паверыла: і падлога памыта, і вячэра стаіць на стале.

— Хто ж гэта ў нас гаспадарыў? — здзівілася мама.

— Я! — весела адказала Настачка. Мама прыгарнула дачку да сябе, пацалавала ў адну, пасля ў другую шчаку і сказала:

— Памочніца ты мая дарагая! Гаспадынька ты мая слаўная!

*Паводле Я. Бяганскай* [13]

**3.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

Гутарка па пытаннях:

— Чаму мама не змагла памыць падлогу? Як ёй дапамагла Настачка? Як мама выказала ўдзячнасць дачушцы?

Адказ на праблемнае пытанне па змесце апавядання:

— Як Настачка выказала любоў і павагу да маці?

**3.4. Гульня «Хто больш?».**

Вучні прыгадваюць словы з апавядання, якія суадносяцца з тэмай «Мая кватэра». Кожны наступны вучань павінен паўтарыць словы папярэдніх і яшчэ дадаць слова.

**3.5. Выкананне заданняў на падставе праслуханага твора.**

Выказванні вучняў па кожным малюнку з вызначэннем сказа, адпаведнага схеме.

1. Настачка накрыла маму.
2. Дзяўчынка вырашыла памыць падлогу.
3. Настачка старанна выкручвала анучу.
4. Памочніца ты мая дарагая! (Або) Гаспадынька ты мая слаўная!

Пераказ апавядання па малюнках.

**III. Вынік урока.**

Адказ на пытанні:

— Які гук вучыліся вымаўляць на ўроку? Чым адрозніваецца гук [р] у рускай і беларускай мовах? Якія словы ў рускай і беларускай мовах гучаць падобна, але называюць розныя прадметы?

## Урок 8. Я і мая сям'я. Рэжым дня

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [дз']; пазнаёміць з лексікай, звязанай з выкананнем рэжыму дня, размежаваць значэнне слова *час* у рускай і беларускай мовах; фарміраваць уменні аўдзіравання (суадносіць пачутае з дэфармаваным малюнкавым радам, адказваць на пытанні па змесце, вызначаць у тэксце словы з гукам [дз'], суадносіць змест тэксту з уласным вопытам); фарміраваць уменні гаварэння (выказвацца па малюнках да твора, будаваць маналагічнае выказванне пра свой рэжым дня з апорай на лексіку твора); фарміраваць уменне завучваць на памяць; развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць; выхоўваць дысцыплінаванасць, прывучаць да здаровага ладу жыцця, выканання рэжыму дня.

**Абсталяванне:** малюнкі з дэманстрацыйнага матэрыялу: «Дзіцячы пакой», «Гасціная», «Рэжым дня», гадзіннік, шафа, стол, ложак, рыс, грэчка, рэпа, крук; карткі з літарамі ***Р***, ***Б***.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**1. Гульня «Перакладчыкі».**

Настаўнік дэманструе малюнкі (рыс, грэчка, рэпа, крук) і паказвае карткі з літарамі ***Р***, ***Б***. Вучні называюць словы спачатку на рускай мове, потым на беларускай мове (*рис — рыс, гречка — грэчка, репа — рэпа, крюк — крук*). Гульня можа быць арганізавана франтальна (настаўнік выклікае вучняў выбарачна або вучні адказваюць хорам), у парах (заданне выконваюць два вучні каля дошкі, астатнія вучні ацэньваюць правільнасць вымаўлення імі гукаў). Яшчэ адзін варыянт арганізацыі гульні: выкліканы вучань паказвае малюнак і адну з картак з літарамі ***Р***, ***Б***. Вучні вымаўляюць слова хорам. Вучань ацэньвае правільнасць вымаўлення.

**2. Паўтарэнне лексікі па тэме «Мая кватэра».**

Работа па ўзнаўленні лексікі арганізуецца франтальна па дэманстрацыйных малюнках «Дзіцячы пакой», «Гасціная». Настаўнік называе словы, выкліканыя вучні паказваюць прадметы і паўтараюць іх назвы (шафа, стол*ь*, люстра, дыван, канапа, падлога).

— Якія словы падобныя да слоў рускай мовы? Што яны абазначаюць у рускай мове? У беларускай мове?

**3. Гульня «Так ці не?».**

Праводзіцца на матэрыяле загадак. Настаўнік чытае загадку і паказвае мяркуемую адгадку на дэманстрацыйным малюнку. Вучні павінны хорам сказаць «так» ці «не». Калі адгадка паказана правільна, то вучні называюць прадмет і гавораць, як яны здагадаліся. Калі адгадка паказана няправільна (вучні адказалі «не»), настаўнік паказвае іншы прадмет, пакуль не будзе выбраны той, які вучні лічаць адгадкай. Такі спосаб арганізацыі работы можа быць складаным для вучняў класа. У гэтым выпадку адгадванне загадак праводзіцца традыцыйна з абавязковым тлумачэннем адгадкі на аснове тэксту загадкі, адгадкі вучні знаходзяць на малюнках, змешчаных на дошцы.

Дом драўляны стаіць,
У ім адзенне вісіць...
Дзверы ёсць, і ёсць ключы,
Толькі ў дом той не зайсці. *(Шафа.)*

*В. Жуковіч* [14]

Неахайных і мурзуляў
Вельмі-вельмі не люблю я.
І з усмешкай прамяністай
Сустракаю дзетак чыстых. *(Люстра.)*

*Н. Галіноўская* [15]

Тым, хто любіць працаваць,
Мне спачын прыемна даць.
Лежабоку, гультая
Так хацеў бы скінуць я. *(Ложак.)*

*Н. Галіноўская* [15]

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыку вымаўлення гука [дз'].**

**1.1. Работа з матэрыялам задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

Вызначэнне па малюнках гукавых асацыяцый, звязаных з прадметамі на малюнках (званочак — дзінь-дзінь, камар — [дззз'], дзвярны званок — дзііінь, разбітая ваза — дзінь). Вылучэнне гука [дз']:

— У беларускай мове ёсць гук, які нагадвае звон. Гэта гук [дз'].

Назіранне за вымаўленнем гука [дз'] настаўнікам, вымаўленне вучнямі ізаляванага гука [дз'].

**1.2. Дрылінг з выкарыстаннем чыстагаворак.**

Настаўнік называе склад, вучні хорам яго рытмічна паўтараюць некалькі разоў, пакуль настаўнік не плясне ў далоні (гэта трэба зрабіць, калі правільнае вымаўленне будзе ў большасці вучняў). Пасля гэтага настаўнік называе слова, вучні вымаўляюць яго хорам і індывідуальна. Пры неабходнасці настаўнік тлумачыць значэнне слова.

Дзе-дзе-дзе — дзень,
дзе-дзе-дзе — дзеці,
дзі-дзі-дзі — дзіва,
дзі-дзі-дзі — дзік,
дзя-дзя-дзя — дзядзечка,
дзя-дзя-дзя — дзядуля,
дзё-дзё-дзё — дзённік,
дзё-дзё-дзё — дзёран,
дзю-дзю-дзю — дзюбка,
дзю-дзю-дзю — дзюрка,
дзя-дзя-дзя — дзяўчынка,
дзя-дзя-дзя — дзяцел.

**2. Азнаямленне з лексічнай тэмай «Мае сваякі».**

**2.1. Работа з матэрыялам задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

Гутарка па малюнках праводзіцца з мэтай вызначэння тэматыкі ўрока. Спачатку трэба звярнуць увагу вучняў на паслядоўнасць малюнкаў: знайсці і патлумачыць першы, апошні, прамежкавыя (па стрэлках); назваць, што агульнае на малюнках, чаму ў іх такая паслядоўнасць. Тлумачэнне паслядоўнасці малюнкаў суправаджаецца азнаямленнем з лексікай (раніца, дзень, вечар, снеданне, абед, падвячорак, вячэра, гадзіннік). Вучні выконваюць заданні настаўніка:

— Знайдзіце малюнак, на якім адлюстравана снеданне. Як вы здагадаліся? Знайдзіце малюнак, на якім адлюстраваны абед. Дзе абедаюць вучні? Знайдзіце малюнак, на якім адлюстраваны падвячорак. Чым дзеці падсілкоўваюцца на падвячорак? Знайдзіце малюнак, на якім адлюстравана вячэра. Хто вячэрае?

**2.2. Гульня «Хто? Дзе? Калі?».**

Праводзіцца гульня па пошуку адпаведных апісанню настаўніка малюнкаў і гутарка па іх. Называнне вучнямі членаў сям'і на апошнім малюнку.

**2.3. Завучванне верша на памяць.**

Падрыхтоўчая гутарка перад успрыманнем верша:

— Што абазначае слова *гадзіннік*? (Настаўнік трымае ў руках гадзіннік ці яго выяву з набору дэманстрацыйнага матэрыялу). Паслухайце верш і вызначыце словы з гукам [дз']. (Настаўнік чытае верш крыху запаволена з выразнай артыкуляцыяй.)

Мой гадзіннік,
Дзінь-дзінь-дзіннік,
Зазвініць ён,
Дзінь, дзінь, дзінь —
Значыць,
Сем якраз гадзін...
Трэба з ложка паднімацца,
На заняткі не спазняцца.

*А. Дзеружынскі* [16]

Адказ на пытанне:

— Для чаго нам трэба ведаць, колькі зараз часу?

Вучні называюць словы з гукам [дз']. Запытваюцца пра незразумелыя словы.

Завучванне верша арганізуецца па два радкі. Дэкламацыя верша пасля завучвання можа быць арганізавана ў форме выступлення чатырох вучняў каля дошкі. Астатнія вучні ацэньваюць правільнасць вымаўлення і гучнасць дэкламацыі.

***Хвілінка адкрыццяў.***

Адказ вучняў на пытанні:

— Для чаго патрэбны гадзіннік? Як ён называецца па-руску? *(Часы.)* Чаму па-беларуску называецца *гадзіннік*? *(Паказвае гадзіны і хвіліны (мінуты).)*

Настаўнік тлумачыць, што слова *час* на беларускай мове адпавядае слову *время* ў рускай мове.

— Што паказвае гадзіннік? *(Гадзіннік паказвае час.)* А рускаму слову *час* адпавядае беларускае слова *гадзіна*.

Настаўнік з дапамогай картак з літарамі ***Р***, ***Б*** прапануе вучням перакласці на рускую мову словы *гадзіна, час, гадзіннік*. На беларускую мову: *часы, время, час* (вымаўляць па-руску). Настаўнік запытваецца:

— У колькі гадзін вы ўстаяце? Хто вас будзіць: гадзіннік ці мама?

**3. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 3 вучэбнага дапаможніка).**

**3.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

Падрыхтоўчая гутарка перад успрыманнем на слых прысвечана неабходнасці выканання рэжыму дня і таму, які рэжым дня выконваюць вучні. Настаўнік запрашае даведацца пра рэжым дня Ганкі, Стася і Марціна. Пасля разгляду малюнкаў у паслядоўнасці, зададзенай у вучэбным дапаможніку, і прагназавання зместу па кожным малюнку вучні заўважаюць парушэнні рэжыму дня. Яны выказваюць свае прапановы па паслядоўнасці малюнкаў.

**3.2. Успрыманне твора на слых.**

Слуханне апавядання, суаднясенне вучнямі зместу з малюнкавым радам — знаходжанне і паказ адпаведнага малюнка ў працэсе слухання — выпраўленне неадпаведнасці ў паслядоўнасці выкладу твора і малюнкаў. Выкананне заданняў на актуалізацыю ў час слухання.

***Наш дзень***

Ганка,
Стась
І я, Марцін,
Мы раскажам вам аб тым,
Як жывём і дружым мы,
Як расцём мы дужымі.
Пачынаем дзень спачатку
Фізкультурнаю зарадкай.

*(Пакажыце малюнак. Падыміце руку тыя, хто таксама пачынае дзень з зарадкі.)*

(Наступнае чатырохрадкоўе вымаўляецца хорам.)

Возьмем шчоткі — зубы тром
Беласнежным парашком.
З мылам мы пад кранам мыем
Рукі, вушы, твар і шыю.

*(Знайдзіце адпаведны малюнак. Давайце вымавім разам са мной і пакажам рукі, вушы, твар і шыю.)*

(Наступнае двухрадкоўе вымаўляецца хорам з рухамі.)

За сталом утрох сядзім.
Мы з ахвотаю ядзім.

*(Пакажыце малюнак.)*

Мы і дома пасабляем:
Я падлогу падмятаю,
Фартушок надзеўшы, Ганна
Мые кубачкі старанна.
Стась сваю работу знае —
Ён вазоны палівае.

*(Адкажыце, гледзячы на малюнак, што робяць Марцін, Ганка і Стась.)*

Дом вялікі. На двары
Шмат гуляе дзетвары —
Разам з імі, як сябры,
Мы гуляем на двары,
Водзім карагоды.
Весела заўсёды.

*(Пакажыце малюнак. Колькі часу вы звычайна праводзіце на вуліцы?)*

Кнігі мы не забываем,
Кнігі ўважліва чытаем.

*Паводле А. Александровіча* [17]

— Які малюнак падыходзіць да гэтых слоў? Колькі часу вы чытаеце ці слухаеце чытанне? Давайце вымавім словы з гукам [дз'], якія пачулі ў вершы: дзеці, сядзім, ядзім.

**3.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

Пастаноўка пытанняў і выказванні вучняў па кожным малюнку да твора ў правільнай паслядоўнасці, ужыванне новай лексікі. Вызначэнне і абмеркаванне рэжыму дня вучняў з твора і вучняў класа.

**3.4. Выкананне заданняў на падставе праслуханага твора.**

Выкананне заданняў настаўніка:

— Знайдзіце малюнак, на якім адлюстравана, як дзеці ядуць. Як вы думаеце, што намаляваў мастак: снеданне, абед, вячэру ці падвячорак? Якое слова вам зразумелае без перакладу? Што такое «вячэра»? Чаму так назвалі? Што такое «падвячорак»? Што значыць «снеданне». Калі снедаюць? Калі абедаюць? Калі вячэраюць?

**III. Вынік урока.**

Адказ на пытанні:

— Які гук беларускай мовы вучыліся вымаўляць? Што цікавае вы даведаліся пра рэжым дня? Як называецца прадмет, які паказвае час?

## Урок 9. Я і мая сям'я. Асабістая гігіена

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [ц']; пазнаёміць з лексікай, якая абазначае прадметы асабістай гігіены, з наяўнасцю ў беларускай мове слоў, значэнне якіх падказвае само слова (так званыя гаваркія словы); фарміраваць уменні аўдзіравання (прагназаванне зместу твора на аснове малюнкаў, вызначэнне персанажаў апавядання, суаднясенне зместу з малюнкавым радам); фарміраваць уменні гаварэння (выказванні па кожным малюнку да твора, разгляд схем і складанне сказаў па іх); фарміраваць уменне завучваць на памяць; развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць; прывучаць да акуратнасці, выхоўваць беражлівасць.

**Абсталяванне:** малюнкі з дэманстрацыйнага матэрыялу: «Рэжым дня», кот, кот мые спіну, кот мые жывот, кот мые лапкі, кот мые хвост, дзіця з павучальным жэстам, кот сядзіць, мыла ў мыльніцы; ручнік, расчоска, мыла, зубная шчотка, нажнічкі, насоўка, сурвэткі; карткі з літарамі ***Р***, ***Б***.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

Работа арганізуецца па малюнках з дэманстрацыйнага матэрыялу.

<u>Спосаб правядзення 1.</u> Настаўнік выклікае да дошкі вучняў, дае кожнаму дэманстрацыйны малюнак з набору «Рэжым дня» і просіць дзяцей стаць у такой паслядоўнасці, каб атрымаўся правільны рэжым дня. Астатнія вучні ацэньваюць правільнасць выканання задання. Вучні расказваюць па малюнках пра рэжым дня.

<u>Спосаб правядзення 2.</u> Настаўнік дае выкліканым да дошкі вучням малюнкі ў няправільнай паслядоўнасці. Пры гэтым вучань трымае малюнак так, каб яго не бачыць. Вучні класа апісваюць тое, што на адлюстравана на малюнку, выкліканыя вучні павінны здагадацца, які гэта рэжымны момант. Калі ўсе малюнкі будуць апісаны, вучні становяцца ў правільнай паслядоўнасці. Вучні класа ацэньваюць правільнасць выканання задання.

Настаўнік дае заданне зрабіць крок наперад тым вучням, у якіх на малюнках дзеці займаюцца асабістай гігіенай. Гэтыя карткі замацоўваюцца на дошцы. Вызначаецца тэма ўрока — «Асабістая гігіена».

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыку вымаўлення спалучэння гука [ц'].**

**1.1. Знаёмства з гукам [ц'].**

Назіранне за вымаўленнем настаўнікам гука [ц'], вымаўленне вучнямі ізаляванага гука [ц'], складоў з ім. Словы настаўніка.

— Давайце пазнаёмімся з гукам беларускай мовы, якога няма ў рускай мове. Гэта гук [ц']. (Вучні павінны пачуць, што гэта [ц'], а не [т'], і вымавіць ізаляваны гук некалькі разоў.) Паслухайце словы на рускай і беларускай мовах*: тело — цела, тень — цень, тихо — ціха, тюльпан — цюльпан*. Якімі гукамі яны адрозніваюцца? Вымавім словы па-беларуску.

Настаўнік увесь час звяртае ўвагу на правільнасць вымаўлення. Пажадана, каб асобныя вучні прадэманстравалі ўзорнае вымаўленне ізаляванага гука [ц'] і слоў з ім.

**1.2 Работа з матэрыялам задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

Разглядванне малюнкаў. Вызначэнне, чым малюнкі падобныя, чым адрозніваюцца. Складанне сказаў па малюнках і схеме пад малюнкамі. *(Коцік мые жывоцік. Коцік мые хвосцік.)* Знаходжанне месца гука [ц'] у словах *коцік, жывоцік, хвосцік*. *(У сярэдзіне слоў.)* Прасочванне ў схемах слоў умоўна адзначанага месца гука [ц'], выразнае вымаўленне слоў вучнямі. «Чытанне» вучнямі кожнага сказа па схеме з выразным вымаўленнем гука [ц'] у словах. Узаемаацэнка правільнасці вымаўлення.

**1.3. Завучванне верша на памяць.**

Падрыхтоўчая гутарка перад слуханнем верша. Прыгадванне тэмы ўрока. Згадванне вучнямі, як каты захоўваюць асабістую гігіену.

Слоўнікавая работа. Перад слуханнем верша варта вызначыць сэнс слова *брудны*. Для гэтага настаўнік дае заданне здагадацца пра яго значэнне, калі гэта слова адваротнае, супрацьлеглае слову *чысты*. Вучні выказваюць свае меркаванні пра значэнне слова *брудны*.

— Каго называюць «малы»? Прыгадайце, каго з членаў сям'і так можна назваць.

Пастаноўка мэтавага пытання. Настаўнік прапануе паслухаць верш пра коціка і сказаць, для чаго ён мыецца.

***Коцік***

Брудным быць не хоча коцік:
Мые спінку і жывоцік.
Мые лапкі, хвосцік мые...
Вучыць коціка малы:
— Станеш чыстым, коце мілы,
Калі будзеш мыцца з мылам.

*В. Гардзей* [18]

Адказ вучняў на пытанні:

— Для чаго мыецца коцік? Чаму вучыў коціка малы?

Паўторнае слуханне вучнямі верша з мэтай вылучэння слоў з гукам [ц']. (Настаўнік выразна вымаўляе словы з [ц'].)

Вучні называюць словы з гукам [ц'] і прагаворваюць іх хорам. З дапамогай настаўніка вызначаюць месца гука [ц'] у словах.

Завучванне верша праводзіцца па адным радку з дапамогай апорных малюнкаў: кот, кот мые спіну, кот мые жывот, кот мые лапкі, кот мые хвост, дзіця з павучальным жэстам, кот сядзіць, мыла ў мыльніцы. Пры вымаўленні кожнага радка верша настаўнік вывешвае адпаведныя малюнкі. Вучні паўтараюць за ім кожны радок.

Брудным быць не хоча коцік
*(малюнак: кот)*:
Мые спінку і жывоцік
*(малюнкі: кот мые спіну, кот мые жывот)*.
Мые лапкі, хвосцік мые
*(малюнкі: кот мые лапкі, кот мые хвост)*…
Вучыць коціка малы
*(малюнак: дзіця з павучальным жэстам)*:
— Станеш чыстым, коце мілы
*(малюнак: кот сядзіць)*,
Калі будзеш мыцца з мылам
*(малюнак: мыла ў мыльніцы)*.

Вучні разам з настаўнікам хорам паўтараюць верш па малюнках. Некалькі вучняў расказваюць верш індывідуальна ці па частках.

**2. Азнаямленне з лексічнай тэмай «Асабістая гігіена».**

**2.1. Работа з матэрыялам задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

Гутарка па малюнку. Настаўнік знаёміць вучняў з дзяўчынкай, якую завуць Таня. Вызначэнне фрагмента рэжыму дня, адлюстраванага на малюнку. Называнне па-беларуску прадметаў асабістай гігіены настаўнікам (ручнік, расчоска, мыла, зубная шчотка, нажнічкі, насоўка, сурвэткі) з дэманстрацыяй рэальных прадметаў. Пошук адпаведных прадметаў вучнямі на малюнку і вымаўленне іх назваў.

Азнаямленне з лексікай, якая абазначае часткі цела чалавека.

— Паслухайце верш і запомніце, як па-беларуску называюцца часткі цела чалавека.

Гэта — вочкі,
*(Пакажыце на малюнку дзяўчынкі ў падручніку.)*
Гэта — носік,
*(Пакажыце.)*
Гэта — роцік,
*(Пакажыце.)*
Гэта — вушка,
*(Пакажыце.)*
Гэта — маміна дачушка.
*(Пакажыце на малюнку ў падручніку.)*

*Н. Тулупава* [16]

Настаўнік і вучні мяняюцца ролямі. Дзеці прагаворваюць, а настаўнік паказвае на малюнку. Калі настаўнік «памыляецца», дзеці яго выпраўляюць.

— Назавіце прадметы асабістай гігіены. Што робяць кожным з іх?

Настаўнік прапануе паслухаць верш пра дзяўчынку Танечку і сказаць, што яна ўжо навучылася рабіць.

***Я сама***

— Хадзі, будзем апранацца...
— Я сама! Я сама!
— Хадзі, будзем умывацца...
— Я сама! Я сама!
— Дык хадзі хоць прычашу я...
— Я сама! Я сама!
Вось умеліца якая
Наша Танечка малая!

*І. Муравейка* [19]

Адказ на пытанне:

— Што малая Танечка ўжо навучылася рабіць сама?

Чытанне верша па ролях: настаўнік чытае словы бацькоў, вучні — словы Тані. Або дзеці хорам чытаюць словы бацькоў, а вучаніца — Тані.

Адказ на пытанні:

— Якія прадметы гігіены патрэбныя, каб умыцца, прычасацца? Чаму людзі выконваюць правілы асабістай гігіены?

**2.2. Гульня «Так ці не?».**

Гульня праводзіцца з мэтай замацавання лексікі, якая абазначае прадметы асабістай гігіены, і вызначэння прызначэння прадметаў асабістай гігіены.

Настаўнік паказвае прадметы і гаворыць:

— Гэта ручнік. Ручніком выціраюць твар, рукі, цела. Так ці не?

— Гэта зубная шчотка. Зубной шчоткай расчэсваюць валасы. Так ці не?

— Гэта расчоска. Расчоскай чысцяць зубы. Так ці не?

— Гэта нажніцы. Нажніцамі стрыгуць пазногці. Так ці не?

— Гэта насоўка. Насоўкай выціраюць нос. Так ці не?

Вучні выбіраюць адказ. Калі выбраны адказ «не», то даюць правільны адказ.

***Хвілінка адкрыццяў.***

Настаўнік паведамляе, што ў беларускай мове ёсць «гаваркія» словы. Яны самі падказваюць сваё значэнне. Вучні спрабуюць знайсці такія словы сярод тых, якія зараз называлі. Калі гэта не атрымліваецца, то настаўнік паказвае прадметы (ручнік і насоўку), вучні іх называюць і гавораць пра прызначэнне: выціраць рукі (ручнік), выціраць нос (насоўка). Надалей такія словы варта вылучаць і фіксаваць у свядомасці вучняў.

**3. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**3.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

Падрыхтоўчая гутарка перад успрыманнем на слых пра акуратнасць і яе праявы. Прагназаванне зместу твора на аснове малюнкаў, вызначэнне персанажаў апавядання.

Слоўнікавая праца. Прыгадванне значэння слова *брудны*. Знаходжанне на малюнках выяў, адпаведных выразам: *брудныя хусткі, падраная сукенка, кудлатыя валасы, чыстыя хусткі, зашытая сукенка, прычасаныя валасы.*

Пастаноўка мэтавага пытання:

— Паслухайце твор і скажыце, хто правучыў дзяўчынку.

**3.2. Успрыманне твора на слых.**

Слуханне апавядання, суаднясенне зместу з малюнкавым радам. Пры неабходнасці актуалізацыя ў час слухання.

***Вецер і Тоня***

Гуляў Вецер па палях, па лугах і заляцеў у вёску. А ў той вёсцы быў дворык. А на тым дворыку стаяла хатка. А ў той хатцы жыла гультаяватая Тоня. Выйшла Тоня з хаткі і пачала развешваць на вяроўцы свае хустачкі. Прыгледзеўся Вецер і ўбачыў, што хустачкі дрэнна вымыты. Здзівіўся ён і пытае ў Тоні:

— Навошта ты брудныя хусткі вешаеш?

А Тоня ў адказ:

— Дожджык дамые.

І пайшла ў хату.

І вось паліў дожджык. Змачыў ён Тоніны хусткі. А Вецер падзьмуў, сарваў іх з вяровачкі ды як шпурне на зямлю. І паляцеў. А Тоніны хусткі яшчэ бруднейшымі сталі.

Назаўтра Вецер зноў прыляцеў на Тонін дворык. Убачыў, што Тоня са скакалкай гуляе, а на ёй падраная сукенка. Пачаў ён дзьмуць з усяе сілы. Холадна стала Тоні, і пабегла яна дахаты.

І на трэці дзень прыляцеў Вецер на Тонін дворык. Убачыў, што Тоня катаецца на веласіпедзе, а галава ў яе кудлатая, непрычасаная. Падзьмуў Вецер на яе валасы, ды так моцна, што тыя ў касмылі пазакручваліся.

Прыляцеў ён да Тоні на чацвёрты дзень. І вось што ўбачыў: на вяроўцы вісяць чыстыя хустачкі. На Тонінай сукенцы не відаць дзіркі, а валасы на галаве дзяўчынкі гладка прычасаныя.

Усміхнуўся Вецер, ласкава пагладзіў Тоню па галоўцы і паляцеў. Больш яму тут не было чаго рабіць. Бо гэта ж Тоня вымыла хустачкі. Гэта ж Тоня зашыла дзірку на сукенцы. Гэта ж Тоня прычасала гладка валасы.

Вось які Вецер-настаўнік.

*А. Кобец-Філімонава* [20]

**3.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

Гутарка па пытаннях:

— Што ўбачыў вецер на двары ў першы дзень? Другі дзень? Трэці дзень? Чацвёрты дзень? Як паводзіў сябе Вецер кожны дзень? Чаму? Чаму вецер навучыў дзяўчынку?

**3.4. Выкананне заданняў на падставе праслуханага твора.**

Выказванні вучняў па кожным малюнку да твора. Разгляд схем сказаў. Складанне сказаў па схемах, «прачытванне» іх:

1. Навошта ты брудныя хусткі вешаеш? Дожджык дамые.
2. Тоня гуляе са скакалкай.
3. Дзяўчынка катаецца на веласіпедзе.
4. У Тоні зашытая сукенка і чыстая хустка.
5. Вецер усміхнуўся Тоні.

**III. Вынік урока.**

— Які гук беларускай мовы мы вучыліся вымаўляць? Назавіце словы з гэтым гукам. Якія рэчы патрэбныя для асабістай гігіены? Які эпізод казкі вам асабліва запомніўся?

### Урок 10. Я і мая сям'я. Адзенне і абутак

**Мэта ўрока:** узнавіць навык вымаўлення гука [ц'], працягваць фарміраванне вымаўленчых навыкаў пры выкананні практыкаванняў; пазнаёміць з лексікай, якая абазначае адзенне і абутак; фарміраваць уменні аўдзіравання (прагназаванне зместу твора на аснове малюнкаў, суаднясенне зместу з малюнкавым радам, адказ на пытанні па змесце твора); фарміраваць уменні гаварэння (выказванні па кожным малюнку да твора, разгляд схем і складанне сказаў па іх); развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць; выхоўваць акуратнасць, уменне правільна апранацца.

**Абсталяванне:** зубная шчотка, расчоска, насоўка, ручнік, люстэрка, мыла; малюнкі з дэманстрацыйнага матэрыялу: шафа, боты, шкарпэткі, чаравікі, спадніца, сукенка, штаны, шалік, кашуля.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**1. Практыкаванне на ўзнаўленне навыку вымаўлення гука [ц'].**

Вучням трэба паслухаць словы, назваць склад з гукам [ц'], вымавіць усё слова.

| | | | |
|---|---|---|---|
| цяжка | цёпла | ціна | цюль |
| цяля | цётка | ціск | цюфяк |
| вязуць | кіпець | пяюць | рабіць |

**2. Практыкаванне на паўтарэнне лексікі па тэме «Асабістая гігіена».**

**Гульня «Што чыё?».**

Настаўнік паказвае прадметы (але не называе іх) і кажа, каму яны належаць. Вучні называюць прадмет і кажуць, каму ён належыць.

*Узор:*

Настаўнік: татава (паказвае зубную шчотку).

Вучні: татава зубная шчотка.

Татава (зубная шчотка), матуліна (расчоска), бабуліна (насоўка), Міколкаў (ручнік), Аленчына (люстэрка), дзядулева (мыла).

Напрыканцы вучні павінны назваць прадметы правільна. Успомніць, каму яны належаць.

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**2. Азнаямленне з лексічнай тэмай «Адзенне і абутак».**

**2.1. Уступная гутарка, вызначэнне тэмы ўрока.**

Уступная гутарка праводзіцца на аснове слыхавога ўспрымання верша. Перад слуханнем верша ставіцца мэтавае пытанне: «Паслухайце верш і скажыце, чаму злуецца Фядот».

Калі ранак настае —
гора ад Фядота:
— Хто надзеў штаны мае?
Куды збеглі боты?
Пераверне ўсё ўверх дном,
бегае, злуецца:
— Тут, на стуле, за сталом,
я іх клаў, здаецца.

*І. Муравейка* [21]

Пасля ўспрымання верша і адказаў на мэтавае пытанне гутарка працягваецца:

— На што злаваўся Фядот ранкам? Як вы разумееце выраз «пераверне ўсё ўверх дном»? Як вы думаеце, у якім пакоі ўсё адбывалася? Што вы параіце Фядоту? Пра якія прадметы адзення і абутку гаворыцца ў вершы?

Вызначэнне тэмы ўрока.

**2.2. Работа з дэманстрацыйным матэрыялам.**

На дошцы замацаваны малюнак шафы. Вучні называюць гэты прадмет мэблі і гавораць, для чаго ён. Настаўнік паведамляе, што каля малюнка шафы трэба змясціць малюнкі адзення, а ўнізе дошкі «паставіць абутак» — замацаваць малюнкі абутку. Настаўнік паказвае малюнкі, называе прадметы (боты, шкарпэткі, чаравікі, спадніца, сукенка, штаны, кеды, шалік, кашуля), а вучні гавораць, гэта адзенне ці абутак, і размяшчаюць малюнак у адпаведным месцы на дошцы. Пасля гэтага хорам паўтараюць словы па малюнках на дошцы.

У працэсе работы мэтазгодна запытацца, калі вучні сутыкаліся са словамі *чаравікі, сукенка*.

**2.3. Работа з матэрыялам задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

Распазнаванне і называнне прадметаў адзення і абутку па малюнках. Пабудова сказаў з абагульняльнымі словамі па схемах (работа ў парах). Узаемаацэнка выканання задання вучнямі.

**2.4. Работа з матэрыялам задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

Разглядванне малюнкаў, гутарка з мэтай вызначэння задання. Лексічная гульня «Што чыё?». Вызначэнне назваў адзення і абутку хлопчыка і дзяўчынкі.

Разыгрыванне маўленчай сітуацыі «Апрані ляльку» з мэтай размеркавання адзення і абутку паміж хлопчыкам і дзяўчынкай можа быць арганізавана спачатку ў парах. Пасля гэтага праверка ажыццяўляецца франтальна з узаемаацэнкай вучнямі правільнасці падбору слоў для называння прадметаў адзення і абутку.

**3. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**3.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту, пастаноўка мэтавага пытання.**

Падрыхтоўчая гутарка перад успрыманнем на слых. Прагназаванне зместу на аснове малюнкаў, называнне прадметаў адзення на малюнках. Адказ на пытанні:

— Куды пайшоў хлопчык? Чаму ён стаў распранацца? Паслухайце і скажыце, ці правільна апрануўся хлопчык.

**3.2. Успрыманне твора на слых.**

Успрыманне верша вучнямі на слых, паказ адпаведных малюнкаў. Суаднясенне зместу твора з малюнкавым радам. Пры неабходнасці актуалізацыя ў час слухання.

***Вось дык прагулка!***

Сціхла завіруха,
Сонца пасвятлела.
Пахадзіць на лыжах
Янку закарцела.
Нацягнуў хлапчына
Пару нагавіцаў,
Кофту, цёплы світар,
Каб не прастудзіцца,
Пінжачок таксама,
А наверх — дублёнку,
Да ўсяго дабавіў
Шапку, шаль, валёнкі.
Янка стаў на лыжы
(«Ну й дзянёк — уцеха!») —
І на лес ад дома
Ён пайшоў-паехаў.
Доўга йшоў ці мала,
Як дайшоў да лесу,
На суку дубовым
Цёплы шаль павесіў
Ды няма ратунку:
Млеюць ногі, плечы —
Небараку душна,
Быццам ён у печы.
Янка, разамлелы,
І дублёнку скінуў,
І пінжак, зняў лыжы
Змучаны хлапчына.
Адпачыў, адзеўся,
Ледзь адолеў стому —
Лыжы ўзяў на плечы
І пабрыў дадому.

*Паводле В. Жуковіча* [22]

**3.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

Адказ на праблемнае пытанне па змесце апавядання.

***Хвілінка адкрыццяў.***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў:

— У вершы прагучала «гаваркое» слова *нагавіцы*. Як вы думаеце, што гэта за прадмет адзення? *(Нагавіцы — штаны.)* Якая частка слова падказала вам яго значэнне? Пакажыце нагавіцы на малюнку. Як яшчэ іх называюць?

Гутарка па праслуханым:

— Чаму не атрымалася лыжная прагулка? Як вы разумееце выраз «Небараку душна, быццам ён у печы»? Што перашкодзіла хлопчыку пакатацца на лыжах? Што вы параіце Янку? Як трэба апранацца? Прыгадайце словы з верша, у якіх ёсць гук [дз'].

**3.4. Выкананне заданняў на падставе праслуханага твора.**

Вызначэнне паслядоўнасці малюнкаў. Гутарка па кожным з іх. Разгляд схем сказаў. Складанне сказаў у адпаведнасці са схемамі.

Янка ўзяў лыжы.

Янка зняў пінжак і дублёнку.

Хлопчык павесіў шаль на суку.

Янку душна.

**III. Вынік урока.**

Адказ на пытанні:

— Вымаўленне якіх гукаў беларускай мовы мы паўтарылі? Якія назвы прадметаў адзення і абутку вы запомнілі? Які эпізод твора вам асабліва запомніўся?

## Я і мая сям'я. Паўтарэнне

**Заданне 1.**

Заданне накіравана на паўтарэнне і замацаванне ўжывання лексікі, фарміраванне ўменняў аўдзіравання. Матэрыял задання можа быць выкарыстаны на ўроках па тэме «Я і мая сям'я» для азнаямлення з выразамі *малодшы брат*, *старэйшая сястра*, выхавання павагі да старэйшых і паслухмянасці, фарміравання здольнасці адчуваць жартаўлівы характар твора і рэагаваць на яго.

Работа над жартам адбываецца наступным чынам. Пасля разгляду малюнкаў настаўнік запытваецца, каго са сваякоў вучні пазналі. Пасля адказу прапануе ўдакладніць — паказаць на першым малюнку маці, старэйшую сястру, малодшага брата, патлумачыць, хто з іх большы, а хто меншы, хто старэйшы, а хто малодшы. Настаўнік паведамляе, што гэта жарт — вясёлае і павучальнае апавяданне. Вучням прапануецца адказаць на пытанне загалоўка жарту «Хто каго павінен слухацца?». Настаўнік папярэджвае, што на гэтае пытанне трэба будзе адказаць і пасля праслухоўвання твора.

Настаўнік дае заданне вучням, гледзячы на першы малюнак, паслухаць, што адбывалася, і сказаць, чаму хлопчык сумны.

### *Хто каго павінен слухацца?*

Валерык гуляў на двары. Раптам яго паклікала мама і кажа:

— Сынок, я схаджу да цёткі Ганны, а ты пабудзь з Лідай у хаце. Толькі, глядзі, слухайся яе.

— А чаму я павінен яе слухацца? — спытаў Валерык.

— Таму што яна большая, — адказала маці. — Меншыя заўсёды слухаюцца большых.

***Гутарка па пытаннях:***

— Чаму хлопчык быў сумны? Які наказ дала яму маці? Ці згодныя вы з ёй?

Далей настаўнік прапануе паглядзець на другі малюнак і паслухаць, ці выканаў хлопчык мамін наказ.

Калі маці выйшла з хаты, Валерык стаў на табурэтку, паклікаў сястру і пытае:

— Ліда, хто з нас большы?

Сястра паглядзела на брата і ўсміхнулася:

— Вядома, ты.

Валерык саскочыў з табурэткі і весела крыкнуў:

— Калі я большы, то ты павінна слухацца мяне: пільнуй хату, а я пабягу гуляць.

*П. Рунец* [23]

Вучні адказваюць на зададзенае пытанне і на пытанні:

— Што хлопчык зразумеў няправільна? Ці зменіцца ваш адказ на пытанне аўтара твора: «Хто каго павінен слухацца?»? Як вы слухаецеся сваіх старэйшых братоў і сясцёр, маму з татам, бабулю з дзядулем?

Варта звярнуць увагу, як звалі герояў твора.

Рэкамендуецца зрабіць інсцэніроўку жарту, размеркаваўшы ролі паміж трыма вучнямі, або ў групах па тры вучні. У інсцэніроўцы вучні гавораць толькі словы персанажаў.

**Заданне 2.**

Заданне накіравана на замацаванне лексікі па тэме «Я і мая сям'я», азнаямленне вучняў са сваяцкімі ўзаемаадносінамі, развіццё назіральнасці, дапытлівасці. Матэрыял задання носіць займальны, развіццёвы характар. Вучням спачатку прапануецца назваць сваякоў на малюнку і здагадацца пра заданне, гледзячы на пытальнікі. Далей трэба дадумацца, чаму каля членаў сям'і стаяць адзін ці два пытальнікі, і назваць спачатку тых членаў сям'і, каля якіх стаіць адзін пытальнік (сын, дачка), а потым тых, каля якіх стаяць два пытальнікі, і патлумачыць іх сваяцкія ўзаемаадносіны (матуля, дачка бабулі і дзядулі дзяцей; тата, сын бабулі і дзядулі дзяцей; дзядуля, тата маці ці таты дзяцей; бабуля, мама маці ці таты дзяцей). Трэба ўдакладніць, што на малюнку толькі бацькі аднаго з членаў сям'і: мамы ці таты. Вучням прапануецца расказаць пра сваіх бабуль і дзядуль, як іх завуць, чые яны бацькі — мамы ці таты.

Калі пры выкананні задання ўзнікае непаразуменне ці цяжкасці, арганізуецца работа каля дошкі з выкарыстаннем дэманстрацыйнага матэрыялу (малюнкаў «Мама з татам», «Бабуля з дзядулем»).

**Заданне 3.**

Заданне мае на мэце ўдасканаленне ўменняў аўдзіравання, фарміраванне здольнасці прадбачыць

наступствы сваіх учынкаў, ужываць словы прабачэння, выхоўваць павагу і любоў да старэйшых сваякоў.

Падрыхтоўка да слухання праводзіцца па малюнкавым радзе. Вучням прапануецца разгледзець яго і сказаць, што здарылася, пакуль бабуля спала.

Слуханне апавядання вучнямі, паказ адпаведных малюнкаў.

### *Яшава рукавічка*

Выйшла бабуля ў сад, села на ўслончык і пачала вязаць унуку Яшу рукавічку.

Раніца была цёплая, ласкавая, грэла сонейка, пад страхой пішчалі вераб'і, а ў траве бегаў коцік.

Апоўдні рукавічка была амаль гатова.

Вязала бабуля, вязала ды, седзячы, і заснула.

Коцік убачыў клубок у траве, скокнуў да яго, торкнуў лапкай раз-другі, клубок і закаціўся ў кусты.

А там ляжаў Яша.

— Псік! — прагнаў ён коціка. Потым падняў клубок і пачаў намотваць на яго нітку.

Матаў, матаў, а нітцы няма канца.

Бабуля прачнулася і пляснула ў далоні:

— Бацюхны мае! А дзе ж рукавічка?!

А ад рукавічкі адзін пальчык застаўся.

Усю рукавічку Яша зноў на клубок пераматаў.

*В. Хомчанка* [23]

Праверка разумення праслуханага па пытаннях:

— Што амаль звязала бабуля? Каму яна вязала рукавічку? Хто закаціў клубок у кусты? Чаму Яша стаў змотваць клубок? Як адрэагавала бабуля на здарэнне? Як вы думаеце, што адчуў Яша? Як бы вы павялі сябе ў гэтай сітуацыі?

Трэба прывесці вучняў да асэнсавання неабходнасці прынесці прабачэнне бабулі, інсцэніраваць, як гэта можна зрабіць з ужываннем ветлівых выразаў. Пасля інсцэніроўкі абмеркаваць, што на гэта можа сказаць бабуля, як павесці сябе. Вучні выказваюць свае меркаванні на гэты конт. Робіцца вывад, што трэба паважаць старэйшых, а калі што здарыцца, абавязкова папрасіць у іх прабачэння і больш так не рабіць.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Чарняўскі, М. М.* Колькі ў сонейка сяброў! : апавяданні-гумарынкі, вясёлыя вершы, скорагаворкі, лічылкі, загадкі, казкі, песні : для мал. шк. узросту / М. Чарняўскі; маст. У. Жук. — Мінск : Нар. асвета, 2013. — 88 с. : іл.
2. Калі ранец лёгкі… : вершы, апавяданні : для мал. шк. узросту / уклад. Т. Іванова. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2016. — 112 с. : іл. — (Серыя «Бібліятэка часопіса “Вясёлка”»).
3. *Шыбут, П.* Падручнікі, сшыткі… : сцэнарыі святаў на беларускай мове [Электронны рэсурс] / П. Шыбут. — Рэжым доступу: http://сцэнар.дамен.бел/vosen/zagadki-i-vershy-na-dzen-vedau. — Дата доступу: 07.05.2024.
4. *Бяганская, Я. І.* Сланечнікі : апавяданні : для малод. шк. ўзросту / Я. Бяганская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. — 38, [2] с. : іл.
5. *Солахаў, А. В.* Падарожжа ад А да Я : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. В. Солахаў. — Мінск : Зорны Верасок, 2012. — 263 с.
6. *Буторына, І. А.* Урокі «Вясёлкі» / І. А. Буторына. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2017. — 280 с. — (Серыя «Бібліятэка часопіса “Вясёлка”»).
7. Вясёлы перапынак : сатыра і гумар, усмешкі і жарты : для мал. шк. узросту / маст. Л. А. Зярніцкі. — Мінск : Юнацтва, 1986. — 95 с. : іл.
8. *Пазнякоў, М.* Родная мова : вершы, каламбуры, крылатыя выразы, скорагаворкі, загадкі / М. Пазнякоў. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 24 с.
9. Акрайчык : чытанка для 1–2 кл. / уклад. Г. Каржанеўская, М. Яфімава. — Мінск : Нар. асвета, 1995. — 176 с.
10. *Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 48 с.
11. Светлячок : антология / сост. : Р. Миронова. — Минск : Юнацтва, 1988. — 344 с.
12. *Капыловіч, М.* Дзіравая памяць / Вясёлка : апавяданні, казкі, вершы ; уклад. Т. С. Тарасава, М. А. Маляўка. — Мінск : Юнацтва, 1997. — 224 с.
13. *Бяганская, Я.* Як Настачка маме дапамагала [Электронны рэсурс] / Я. Бяганская. — Рэжым доступу: https://karotkizmest.by/беларуская-літаратура/ядвіга-бяганская/ядвіга-бяганская-як-настачка-маме-дапама.html. — Дата доступу: 07.05.2024.
14. *Жуковіч, В.* Свет — дзівосны : вершы, казкі, п'есы / В. Жуковіч. — Мінск : Юнацтва, 2000. — 332 с.
15. *Галіноўская, Н.* Камп'ютарныя сакрэты : вершы, казкі, жарты, небыліцы, загадкі, смяшынкі, лічылкі, скорагаворкі, пацешкі : для мал. шк. узросту / Н. Галіноўская. — Мінск : Маст. літ., 2002. — 302 с. — (Школьная бібліятэка).
16. Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі / уклад. Т. Тарасава. — Мінск : Юнацтва, 1981. — 224 с.
17. Беларускія народныя казкі і вершы / уклад. Т. І. Кудраўцава. — Гомель : Таволга, 1995. — 40 с.
18. Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. У. Ліпскі, В. Дранько-Майсюк, А. Зэкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. — 255 с.
19. Сонейка : хрэстаматыя дзецям дашкольнага ўзросту / уклад. Р. І. Шостак. — Мінск : Уладзімір Сіўчыкаў, 2013. — 304 с. : іл.
20. *Кобец-Філімонава, А.* Вецер і Тоня / Вянок дзівосаў : казкі / А. Кобец-Філімонава ; маст. Ю. Зайцаў. — Мінск : Юнацтва, 1986. — 78 с.
21. *Муравейка, І. А.* Растуць дзеці : вершы, апавяданні, казкі, загадкі : для малод. шк. ўзросту / І. Муравейка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2011. — 125, [1] с. : каляр. іл.
22. *Жуковіч, В. А.* Гуканне вясны : вершы, казкі, загадкі : для малод. шк. узросту / В. А. Жуковіч, маст. А. І. Аблажэй. — Мінск : Юнацтва, 1992. — 95 с. : іл.
23. Хрэстаматыя для дзіцячага сада і пачатковай школы / уклад. А. І. Сачанка. — Мінск : Ул. М. Скакун, 1997. — 704 с.


*Працяг будзе.*